беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

# НАША НІВА

№ 31 (69)
4 лістапада
1996 г.

выходзіць у панядзелкі

**ТЭЛЕПРАГРАМА**
**20 MTV**
**1** "Сьпіс кніжных бэстсэлераў новага тыдня.
**ПРЭС-РЭЛІЗ**
**6** Сьвет за тыдзень. Кароткія навіны.
**РЭФЭРЭНДУМ**
**7** Шчырая размова: Францускае права.
**СПАЖЫВЕЦ**
**10** Што хаваецца за баўгарскай этыкеткай?
**РОЗНАЕ**
**12** Літва ў «Экстазі».
**Інфарматар**

Адвакат Г.Паганяйла:

## «Калі сёньня мы згубім аднаго Адамовіча, то заўтра мы згубім тысячы»

*Карэспандэнт «НН» Сяргей Харэўскі ўзяў інтэрвію ў адваката Славаміра Адамовіча Гарыя Паганяйлы.*

**«Наша Ніва»: Спадар Паганяйла, нашыя чытачы ўжо ведаюць Вас завочна ў зьвязку з крымінальнай справай паэта Славаміра Адамовіча. Вы рызыкнулі ўзяцца за абарону асобы, якой супрацьстаіць цэлая машына аўтарытарнага рэжыму. Раскажыце крыху пра сябе.**

**Г.Паганяйла:** Я нарадзіўся 14 кастрычніка 1943 году ў лягеры каля станцыі Плісецк Архангельскай вобласьці, дзе адбывала свой тэрмін — пятнаццаць гадоў пазбаўленьня волі — мая маці, Паганяйла Юлія Піліпаўна. Яна туды патрапіла ў 1938, сьледам за мужам, які тут, у Беларускай вайсковай акрузе, займаў надта адказную пасаду — начальніка прававога апэратыўнага аддзела штабу акругі. Ён праходзіў па справе камандзіра акругі Ўбарэвіча. Муж маёй маці загінуў падчас катаваньняў, справа нават не дайшла да суду.

Я, як бачыце, нарадзіўся значна пазьней... Тыя, хто знаёмы з тым, што рабілася ў тагачасных лягерах, мяне зразумеюць. Мой сапраўдны бацька ад мяне не адмаўляўся, ягонае імя ўпісанае ў маю мэтрыку. Ён быў зь лягернае адміністрацыі. Бадай, дзякуючы такому павароту, маёй маці, у пэўным сэнсе, пашанцавала... Яна ж была прысуджаная да расстрэлу, як жонка ворага народу. Тыя дзеці, што нараджаліся ў лягерах, да трох гадоў заставаліся пры маці, пасьля іх адбіралі ў дзетдом. І так да 1961. Бяз права жыць у пэўных рэгіёнах, гарадах і г.д. Маці вызвалілі крыху раней, у 1954, але з-за свайго статусу і стану здароўя яна не магла ўзяць мяне. У 1954 пашанцавала і мне: аслабленых дзетдомаўцаў, па сьмерці Сталіна, з Поўначы разьмеркавалі на Поўдзень. Я скончыў школу ў Крыме.

А ў 1957 маці і яе муж, Паганяйла Іван Хведаравіч (пасьмяротна) былі рэабілітаваныя. Па рэабілітацыі, Мінгарвыканкам выдзяліў маці хрушчовачку. Так сям'я сабралася. У 1962 я пайшоў у войска. Па вяртаньні, у 1965 паступіў на юрфак БДУ. Абраў сабе прафэсію адваката. Працаваў спачатку ў Магілёве, пасьля ў Касьцюковіцкім раёне, народным судзьдзём у Быхаўскім раёне. Пасьля — Міністэрства юстыцыі. Дзесяць гадоў быў начальнікам аддзела адвакатуры ў Міністэрстве. А ў 1989 вярнуўся да адвакацкай практыкі.

Працяг на старонцы 2.

Фірма "Концессия" рэалізуе

ЗАПЧАСТКІ

да МТЗ і НЯМЕЦКАЙ с/г тэхнікі

ШЫНЫ
ЦЭМЭНТ
ШЫФЭР

Магчымы бартэр на с/г прадукцыю

т/ф (017) 220-36-76




Камэнтар на старонцы 2.

Здымкі Уладзіміра Шлапака

## ІРА вяртаецца

Працяг. Пачатак у №29.

Увосень 1922 году ўрад Ірляндзкага дамініёну запатрабаваў у Дайля (ірляндзкага парлямэнту) надзвычайных паўнамоцтваў для барацьбы з ІРА. Новая антытэрарыстычная стратэгія прадугледжвала ўвядзеньне масавых экзэкуцыяў, паскоранае судаводзтва ў справах рэспубліканцаў і г.д.

Толькі ў студзені 1929 г. было расстраляна 34 сябры ІРА, а да траўня колькасьць пакараных сягнула за 700. У вязьніцах апынулася амаль 13.000 рэспубліканцаў. Хоць ІРА завочна прысудзіла ўсіх дэпутатаў Дайля, якія галасавалі за новыя паўнамоцтвы ўраду, да сьмерці, урад і парлямэнт не паддаліся на пагрозы і працягвалі жорсткую лінію рэпрэсіяў адносна ІРА. У такой сытуацыі лідар ІРА Дэ Валера аддаў загад аб капітуляцыі і зьвярнуўся да парлямэнцкіх формаў барацьбы.

Радыкальнае крыло ІРА адмовілася раззбройвацца. Застаўшыся ў меншасьці, яно займалася пераважна дробнымі правакацыямі (узрывы помнікаў ангельскім каралям у Дубліне, лякальныя сутычкі з паліцыяй. Але ў 1927 годзе (праўда, са сваёй ініцыятывы) баявік ІРА забіў вядомага сваімі праангельскімі поглядамі міністра О'Хігінса.

Між тым, на пачатку 30-х гадоў эканамічны крызыс пачаў спрыяць кан'юнктуры нацыяналістычнай апазыцыі, якую ўзначальваў Дэ Валера. Ягоная партыя «Фіяна Фэйл» (Ваяры Ірляндыі) пачынае перадвыбарчую кампанію, да якой падключаецца і ІРА. У 1932 г. Фіяна Фэйл прыходзіць да ўлады. Дэ Валера выконвае свае абяцаньні перад ІРА: яе імя рэабілітаванае, актывістам арганізацыі прапанаваныя пасады ў сілавых структурах рэспублікі, а вэтэранам гарантуюцца пэнсіі.

Працяг на старонцы 4.

Помнікі нашы...

## Стары замак

Хто ня ведае гары Гедыміна (альбо папросту Замкавай) у Вільні? Тут Гедымін заклаў свой пасад. Аднак мураваны замак быў пастаўлены пазьней, у 1393 г. Праўда, падмуркі закладаліся яшчэ за Мяндоўгам, аднак частыя крыжацкія штурмы зводзілі працу муляроў на нішто. І толькі ў 1397-м зьявіліся вежы.

Чаго толькі ні пабачыў замак на сваім вяку! Напрыканцы XVIII ст. ён быў ужо зусім занядбаным, пра што сьведчаць і шматлікія акварэлі і гравюры Смуглевіча, Янушэвіча, Пешкі ды іншых. Але муры яшчэ стаялі, а вежа мела чатыры ярусы...

У 1831-м расейцы спляжылі замак і зрабілі тут фартэцыю. У 1838 г. зь вежы, ад якой пакінулі толькі ўломак з цокалю і аднаго паверху, зрабілі каланчу, дабудаваўшы тры паверхі з дрэва. Амаль так ён і датрываў да нашага стагодзьдзя, пакуль не згарэў... Зьдзічэлыя спаруды сталі месцам для забаваў віленчукоў. Такую пародыю на былую веліч і засьпеў Янка Купала: «Над Вяльлёй-ракой, Па гары крутой Туман сьцелецца; Ні то лом-ламок, Ні то дом-дамок Там віднеецца...»



У 1914 г. расейцы ізноў зрабілі на рэштках замку форт, але не пакарысталіся... Пакарысталіся немцы. Яны моцна ўгрызьліся ў гару, зрабіўшы ў ёй і сховішчы і склады і агнявыя кропкі з розных бакоў, падвёўшы разнастайныя камунікацыі. Тоны нямецкага бэтону і да сёньня схаваныя ў тоўшчы гары. Пасьля ізноў пажар і доўгае занядбаньне. У 1930-м польскія археолягі і рэстаўратары правялі грунтоўную кансэрвацыю замка і дабудавалі тры паверхі вежы. Такою «вежа Гедыміна» і дайшла да нашага часу.

Будаўнікі, якія ўсё мінулае лета шчыравалі на Верхнім замку, згарнулі працу. Улетку йшло ўпартае змаганьне з апаўзьнямі. Найперш былі даведзеныя да ладу вадасьцёкі. Сёньня ўжо ўся Гедымінава гара — у павуціньні замаскаваных ліўнёвых вадасьцёкаў, пра што і не здагадваюцца наведнікі замку.



На працягу стагодзьдзяў ад вільгаці і ветру схілы гары няўхільна спаўзалі, а месцамі сталі настолькі стромымі, што часам абвальваюцца самі. Сёлета ўсходні схіл гары да самага пласту моранай гліны ўмацаваны жалезабэтоннымі палямі, а пазьней тут будзе падсыпаны пласт зямлі.

Магчыма, ня ўсе віленчукі заўважылі й тое, што частка дрэваў высечана. Пад гэтую апэрацыю падпалі толькі хворыя расьліны.

Ва ўмацаваньні мае патрэбу сёньня ўся гара. Не вылучаецца асаблівай надзейнасьцю і яе заходні схіл, на краі якога стаіць замкавая вежа, называная «вежай Гедыміна», хаця збудаваў яе ўнук заснавальніка Вільні — Вялікі князь Вітаўт.

Працяг на старонцы 16

Гісторыя

## КАСТРЫЧНІЦКІ ПЕРАВАРОТ

На галоўнае пытаньне — пра тое, чаму бальшавікі перамаглі ў барацьбе за ўладу ў Петраградзе ў 1917 годзе, дагэтуль не існуе аднназначнага адказу...

Камэнтар гісторыка і дакумэнты на старонцы 13.

## Гаворыць выключанае радыё

31 кастрычніка Менгарвыканкам даў дазвол супрацоўнікам забароненага радыё 101,2FM і Беларускай Асацыяцыі Журналістаў правесьці пікетаваньне на пляцы Волі (плошча Свабоды). Пікет адбудзецца 5 лістапада з 9 да 11 гадзінаў, пасьля з 16 да 18 гадзінаў каля будынку Саюза кампазытараў. Арганізатары пікету патрабуюць неадкладнага вяртаньня ў эфір радыё 101,2 і забесьпячэньня свабоды слова ў краіне! Запрашаем усіх радыёслухачоў, нашых сяброў і прыхільнікаў. Жыве Беларусь!

**Калектыў радыё 101,2,**
**Беларуская Асацыяцыя Журналістаў**

## Падпіска дзеля знаёмства

**У другім паўгодзьдзі многія ўстановы атрымліваюць «Нашу Ніву» бясплатна. Дзякуючы клопату Беларускага Фонду Сораса, наша газэта прыходзіць у навучальныя ўстановы, школы, музэі і клюбы па ўсёй Беларусі. За мінулыя месяцы Вы пазнаёміліся з «НН», і ў новую падпісную кампанію Вам будзе лягчэй зрабіць свой выбар — ці працягнуць падпіску самастойна, ці адмовіцца ад яе.**

**Рэдакцыя вельмі разьлічвае на Ваш удзел. З свайго боку мы мяркуем у новым, 1997-м годзе павялічыць колькасьць старонак газэты, пашырыць нашыя рубрыкі, прысьвечаныя гісторыі і культуры, увесьці некалькі новых тэматычных паласаў. Значна пашырыцца таксама наш «Інфарматар». Адным словам, тыднёвік стане больш арганізаваным, зьмястоўным і прыгожым.**

**Не забудзьцеся працягнуць Вашу падпіску на «НН». Выпісаць тыднёвік можна на кожнай пошце.**

**Наш індэкс: 63125.**

# Нямецкі культурны цэнтар у Менску

30 кастрычніка адбылося ўрачыстае адкрыцьцё Нямецкага культурнага цэнтру імя Гётэ ў Менску. Гэтай падзеі папярэднічаў трохгадовы падрыхтоўчы пэрыяд.

Менскі цэнтар – адзін з 150 культурных цэнтраў Інстытуту імя Гётэ, якія дзейнічаюць у 70 краінах.

Дзейнасьць Нямецкага культурнага цэнтру ў Беларусі пачалася ў ліпені 1993 г. Адзін з новых і галоўных праектаў Нямецкага культурнага цэнтру ў Менску – бібліятэка. Пачынаючы з 1 кастрычніка ўсімі паслугамі бібліятэкі можна карыстацца ў поўным аб'ёме. А гэта 4.000 кніг па філязофіі, псыхалёгіі, рэлігіі, тэалёгіі, сацыялёгіі, статыстыцы, палітыцы, эканоміцы, праву, мове, экалёгіі, выяўленчаму мастацтву, архітэктуры, дызайну, фатаграфіі, музыцы, кіно, тэатру, літаратуры, геаграфіі, гісторыі. У відэатэцы ёсьць мастацкія фільмы, спэктаклі, фільмы пра нямецкія гарады й на гістарычныя тэмы. У бібліятэку рэгулярна паступаюць сьвежыя нумары нямецкіх штодзённых газэтаў, тыднёвікаў і часопісаў розных кірункаў. Усе матэрыялы бібліятэкі, за выключэньнем энцыкляпэдычных выданьняў, мастацкіх альбомаў, газэтаў, часопісаў і відэазапісаў, могуць выдавацца дадому. Бібліятэка Цэнтру Гётэ ў Менску – пасярэднік ва ўсталяваньні кантактаў зь бібліятэчнай сыстэмай Нямеччыны.

**A.Dz.**

GOETHE-INSTITUT MINSK

*Нямецкі культурны цэнтар*
*імя Гётэ ў Менску*
*220034 Менск,*
*Дом літаратара, вул. Фрунзэ, 5*
*тэл. 236-34-33, факс 236-73-14*
*Аддзел мовы — тэл. 236-12-57*
*Бібліятэка — тэл. 236-04-91*
***Бібліятэка працуе:***
***аўторак, чацьвер 15.00-19.00***
***серада, пятніца 14.00-18.00***
***субота 9.30-15.00***



Здымак Уладзімера Шлапака

Французскі тыднёвік «Экспрэс» надрукаваў артыкул па выніках сэнсацыйнага журналісцкага расьследаваньня: высьветлілася, што былы міністар абароны Францыі ва ўрадзе сацыялістаў Шарль Эрню шпіёніў на карысьць Баўгарыі, затым Румыніі і доўгі час – Савецкага Саюзу. Пра гэта стала вядома яшчэ прэзыдэнту Мітэрану, пасьля – прэм'еру Балядзюру і Шыраку, але яны не абнародавалі ганебную для Францыі праўду.

Маладому і амбітнаму Эрню бракавала грошай і ён залез у пазыку. Менавіта на такіх ласых да ўлады і посьпеху маладых людзей палявалі спэцслужбы новых сатэлітаў Масквы, што перанялі досьвед ГПУ. Эрню аплацілі пазыку і выбарчую кампанію, што дала яму мандат дэпутата Нацыянальнага сходу. Уласна заробак за

МІЖНАРОДНЫ КАМЭНТАР

# Думайце, Эрню, думайце

інфармаваньне Сафіі і Бухарэсту Эрню спачатку меў невялічкі. Сваю палітычную кар'еру ён зьвязаў з сацыялістамі. Быў блізкім сябрам Мітэрана і разам зь ім на руінах Францускай сэкцыі рабочага інтэрнацыяналу заснаваў Аб'яднаную Сацыялістычную Партыю, якая пазьней ператварылася ў сучасную ФСП, заўсёды выступаў за цесны саюз з камуністамі.

Ужо ў першы прыезд Эрню ў Маскву аднойчы вечарам ён таямніча зьнік і патлумачыў гэта на раніцы іншым удзельнікам дэлегацыі «прыставаньнямі маскоўскіх прастытутак».

Пасьля перамогі сацыялістаў у 1981 годзе у першым урадзе, у якім удзельнічалі таксама камуністы, Эрню атрымаў ключавы пост міністра абароны.

Якія ж разявакі працуюць у францускай контрразьведцы! Сувязь Эрню з Усходам выявілася толькі пры адкрыцьці архіваў пасьля падзеньня Бэрлінскага муру.

Францыя пацярпела не адну зьнешнепалітычную няўдачу за апошні час. Агульнае асуджэньне францускай праграмы выпрабаваньняў ядзернай зброі ўжо было паставіла Парыж на мяжу міжнароднай ізаляцыі.

Кіраўніка аўтарытарнага каляніяльнага беларускага рэжыму не прынялі нідзе, апроч Анкары (якая сама пасьля перамогі ісламістаў і з прычыны жахлівых парушэньняў правоў чалавека трапіла ў міжнародную ізаляцыю) і Парыжа. Нездарма 18 кастрычніка перад «маючым адбыцца» дзяржаўным пераваротам у Менску менавіта францускі пасол Клёд Жаліф быў тым прадстаўніком Эўропы, які сустрэўся з Лукашэнкам. Пра што казаў з каменным тварам (як было бачна з тэлерэпартажу) Жаліф, можна здагадацца. Апазыцыя і прэса згадалі б Шыраку візыт Лукашэнкі, калі б пераварот адбыўся.

Дарэчы, француская сацыялістычная апазыцыя, несумненна, моцна пацерпіць ад скандалу з Эрню. Мітэран сам у 94-м дапамог упершыню патапіць родную партыю на выбарах. Ці не спрычынілася да гэтага тое, што ён даведаўся пра Эрню?

Сьмерць Эрню ад сардэчнага прыступу ў 90-м, калі вызваліліся краіны Цэнтральнай Эўропы, цяпер здаецца таямнічай і, мабыць, нараджае ня самыя добрыя прадчуваньні ў сэрцах тых дзясяткаў эрню, у тым ліку і нашых, якія й да сёньня занятыя плённай працай, ня думаюць пра сэкунды звысока... Як кажуць, цягаў воўк, пацягнуць і ваўка.

Тут узгадваюцца ня столькі скандалы з Алексы, кіраўнікамі нарвэскіх сацыял-дэмакратаў, Юркансам, колькі шчодрыя перадвыбарчыя кампаніі некаторых нашых «беспартыйных дзеячоў». Шкада іх, бо яны абралі сабе шлях, зь якога ўжо цяжка збочыць.

**Андрэй Рудкоўскі**

# ІРА вяртаецца

Працяг са старонкі 1

Аднак, ня гледзячы на сваю нешматлікасьць, ІРА асьцярожна ставіцца да пэрспэктывы інтэграцыі ў дзяржаўныя інстытуты, і аддае перавагу ўсемагчымым палітычным авантурам. Адна фракцыя яе сяброў супрацоўнічае з камуністамі і стварае дабраахвотную інтэрбрыгаду ў Гішпанію. На іншым баку фронту ў гішпанскім канфлікце, на баку Франка, змагаецца «Ірлядзкі легіён». Гэты атрад сфармаваны пры Ірляндзкай прафашыстоўскай групоўцы «Нацыянальная Гвардыя», што таксама ўключае шмат былых сяброў ІРА. Урэшце, пасьлядоўна змагаючыся з экстрэмізмам, Дэ Валера абвясьціў ІРА па-за законам. Гэта адбылося ў ліпені 1936 г. Але міт пра ІРА аказаўся мацнейшым за ўрадавыя вэрдыкты. Арганізацыя сышла ў падпольле.

У канцы 30-х гадоў фракцыя М.Расэла спрабуе адрадзіць ІРА ў якасьці асноўнай антыангельскай сілы ў ірляндзкім грамадзтве. Ён прапануе новую тэрарыстычную вайну супраць Англіі. Літаральна перад 2-й сусьветнай вайной ІРА праводзіць у ангельскіх гарадах 6 бомбавых атак, якія мелі вялікі рэзананс. М.Расэл спрабуе ўсталяваць кантакты зь нямецкімі фашыстамі, але супрацоўніцтва было нетрывалым: нямецкая субмарына, на якой знаходзіўся лідар ІРА, натыкнулася на ангельскую міну. Немцы, зацікаўленыя ў новых саюзьніках, самі сталі шукаць кантакты з ІРА. Аднак нямецкі рэзыдэнт, закінуты самалётам у Ірляндыю з мэтай каардынацыі мерапрыемстваў ІРА і абвэра, быў хутка арыштаваны.

Да слова, афіцыйны Дублін сам час ад часу выкарыстоўваў пранямецкія дэмаршы. Так, напрыклад, былі прыведзеныя ў стан баявой гатоўнасьці войскі на англа-ірляндзкай мяжы, а ў траўні 1945 г. Дэ Валера выразіў паслу Нямеччыны шкадаваньне ў сувязі са сьмерцю Гітлера.

Аднак вернемся да ІРА. Пасьля абвяшчэньня незалежнасьці Ірляндыі ў 1947 г. арганізацыя цалкам пераключаецца на праблему Ольстэра. У 1956-62 г. у памежнай Паўночнаірляндзкай зоне ІРА праводзіць больш за 500 апэрацыяў і 18 забойстваў, якія мелі мэтай падняць каталікоў Ольстэра на барацьбу. Але масавы рух у падтрымку сэпарацыі Ольстэра справакаваць не ўдалося і ІРА спыніла ўзброеныя дзеяньні.

Час ІРА прыйдзе пазьней. А пакуль у асяродку каталікоў Паўночнай Ірляндыі папулярныя мадэлі супраціву ў выглядзе масавых грамадзянскіх рухаў накшталт тых, што практыкуе антываенны ці мурынскі рух у ЗША.

Паўночная Ірляндыя, безумоўна, зьяўлялася самай недэмакратычнай і неправавой часткай Злучанага Каралеўства і перадумовы руху такога кшталту тут былі. Каталіцкая Ірляндзкая праблема была адной з самых вострых. Справа ішла пра нацыянальную другаснасьць ірляндзкай мовы і культуры, сацыяльнае няраўнапраўе і г.д. Так, напрыклад, у Лёндандэры, дзе дзьве трэці жыхароў былі каталікамі, пратэстанцкая супольнасьць дэлегавала ў органы самакіраваньня 12 чалавек, тады як каталікі толькі 8.

24 жніўня 1968 г. адбыўся першы марш у абарону грамадзянскіх правоў, арганізаваны Паўночна-Ірляндзкай Асацыяцыяй Грамадзянскіх Правоў (NICRA). Наступную дэманстрацыю, якая адбылася 5 кастрычніка ў Дэры, атакавала паліцыя. У адказ каталікі мабілізавалі 15.000 чалавек і правялі новы марш. Паліцыя была бясьсільнай.

У той жа час пачынаюцца маніфэстацыі пратэстантаў, што арганізуюцца пры падтрымцы дзяржаўных структураў.

12 жніўня 1969 г. марш пратэстантаў праз Дэры справакаваў сутычкі з каталікамі. Падчас канфрантацыі паліцыя сьвядома заняла бок юніяністаў (прыхільнікаў уніі з Англіяй). Напружаньне, што стварылася ў Бэлфасьце, прымусіла Лёндан увесьці ў рэгіён войскі. Між тым, у ноч на 14 жніўня экстрэмісцкія пратэстанцкія арганізацыі ізноў атакавалі каталіцкія кварталы. Вынікам пагрому было 5 чалавек забітых і некалькі разбураных дамоў. Ірляндзкае насельніцтва пачало стыхійна ўзбройвацца і ствараць атрады самаабароны, кіраўнічыя пазыцыі ў якіх занялі актывісты ІРА.

У самой ІРА ў гэты час ішло сутыкненьне дзьвюх фракцыяў, што прывяло ў пачатку 1969 г. да расколу арганізацыі. Марксісцкае крыло, т.зв. ІРА (афіцыйная), аддавала перавагу сацыяльна-палітычнай барацьбе. З другога боку, ІРА (часовая), ці «provisorians», зрабіла стаўку на ўзброеныя мэтады супраціву.

Пачатку тэрарыстычных акцыяў ІРА папярэднічалі буйныя рэпрэсіўныя мерапрыемствы Лёндана, як, напрыклад, масавыя аблавы, праведзеныя ангельцамі ў Заходнім Бэлфасьце на пачатку 1970 г., у выніку чаго былі забітыя 4 ірляндцы і параненыя сотні людзей.

31 жніўня 1971 г. правізіяністы забілі ў Бэлфасьце першага брытанскага вайскоўца. Гэта быў адказ на загад ураду торы інтэрнаваць 342 каталікі. Гэтая апэрацыя Лёндана адкрыла новую старонку ўзаемнага гвалту. Да канца 1971 г. у выніку вулічных сутыкненьняў загінула 139 чалавек. Сем месяцаў пазьней, у суботу 30 студзеня вайскоўцы адкрылі агонь па каталіцкай дэманстрацыі ў Дэры, 14 грамадзянаў было забіта. Гэты дзень, які ўвайшоў у гісторыю як «крывавая нядзеля», стаў днём адліку новай гісторыі ІРА, бо цяпер амаль усё маладое пакаленьне паўночных ірляндцаў жадала зьвязаць свой лёс з антыбрытанскім супрацівам.

Рух ІРА не ўяўляе сабой паўстанцкага руху ў ягоным клясычным сэнсе. Гэта хутчэй тэрарыстычныя дзеяньні ізаляваных груп у вялікім мэгаполісе. Такія акцыі ажыцьцяўляюцца на фоне дэманстрацыяў, сутычак... Вялікую ролю грае ўсеагульная падтрымка, якая аказваецца ІРА з боку каталіцкай царквы і мясцовага насельніцтва. Апроч таго, існуюць замежныя ірляндзкія цэнтры, што выконваюць функцыі зьнешняга прадстаўніцтва. Найперш гэта Паўночна-Ірляндзкі Камітэт Дапамогі (NIAC), заснаваны ў 1970 г. у ЗША вэтэранамі ІРА. Гэтая арганізацыя аб'ядноўвае каля 20.000 чалавек, якія займаюцца пастаўкай для ІРА зброі і грошай. Паводле падлікаў ангельскіх спэцслужбаў, NIAC пераправіў у Паўночную Ірляндыю каля 12.000 адзінак зброі і даў для патрэбаў ІРА 10 млн. даляраў.

На працягу сваёй гісторыі ІРА некалькі разоў мяняла свае стратэгічныя ўстаноўкі. Першапачаткова рэспубліканцы вызнавалі тактыку «Jit for Jat» (як гукнецца, так і адклікнецца), якая была своеасаблівай рэакцыяй на правакацыі ультраправых пратэстанцкіх груповак UDA і UVF. Апошнія ставілі сваёй мэтай тэрарызаваць каталікоў шляхам выбухаў у грамадзкіх месцах і г.д. Адказ ІРА быў ідэнтычным. Гэта прывяло да таго, што ў 1972 г. былі забітыя 486 чалавек, зь іх 322 простых грамадзяніна. Самая маштабная акцыя такога кшталту была праведзеная ІРА ў Бірмінгеме, дзе з-за выбуху загінуў 21 чалавек.

Да 1975 г. тактыка ІРА, накіраваная на масавы нематываваны тэрор, зайшла ў тупік. Насельніцтва Паўночнай Ірляндыі, ня лічачыся з канфэсійнымі і рэлігійнымі адрозьненьнямі, сумесна выступіла супраць тэрору. Забойства на пачатку 76-га трох дзяцей падчас інцыдэнту ў Бэлфасьце выклікала масавыя ўсеагульныя страйкі і вялікія дэманстрацыі пратэсту.

У гэтым жа годзе да ўлады ў ІРА прыйшлі Г.Адамс — МакГуанэс, якія прапанавалі новую стратэгію. Стаўка рабілася на вымотваньне ворага. Колькасьць забойстваў супраць цывільнага насельніцтва пайшла ўніз. Галоўнымі мішэнямі атак ІРА сталі цяпер асобы, якія былі выразьнікамі ангельскага імпэрыялізму.

Так, напрыклад, у ліпені 1976 г. быў забіты пасол Злучанага Каралеўства ў Ірляндыі Е.Бігс. У жніўні 1979 г. — кузэн каралевы Элізабэты, у 1983 г. быў падарваны гатэль, дзе жылі дэлегаты зьезду кансэрватыўнай партыі.

Асобна неабходна спыніцца на кампаніі ІРА ў падтырмку палітвязьняў. У кастрычніку 1980 г. сем каталікоў-вязьняў адмовіліся прымаць ежу. Іх патрабаваньні тычыліся пераважна палітычных правоў. У прыватнасьці, яны патрабавалі асаблівага статусу. Галадоўка скончылася частковымі саступкамі з боку ўраду Тэчар. У красавіку 1981 г. пачалася галадоўка афіцэра ІРА Р.Сандса і ягонай групы. Іхняя мужнасьць натхніла ірляндзкі рух ва ўсім сьвеце на шырокую кампанію салідарнасьці з Н-блёкам (месца зьняволеньня Р.Сандса). На выбарах у Ірляндыі 2 вязьні з ІРА былі абраныя дэпутатамі.

Наступным тактычным прыёмам ІРА зьявілася дзейнасьць ейнайга палітычнага крыла Шын Фэйн. Пасьля гераічнай галадоўкі ў Н-блёку папулярнасьць ІРА пайшла ўгару, і ў 1983 г. Шын Фэйн атрымаў на выбарах паводле сьпісаў каля 14%, а лідар шынфэйністаў Г.Адамс стаў дэпутатам. Безумоўна, росту прыязнасьці да ІРА садзейнічала палітычная фізіяномія пратэстанцкіх узброеных арганізацыяў (якія ў сярэдзіне 80-х аказаліся ўцягнутымі ў дачыненьні з нэафашыстамі і гандаль зброяй).

Дарэчы, у 1986 г. ірляндцы прынялі ад М.Кадафі 240 тон боепрыпасаў і выбуховых рэчываў. Сэнс гэтага падарунку тлумачыцца проста: лідар лібійскай рэвалюцыі такім своеасаблівым чынам адпомсьціў Англіі, якая дазволіла ЗША выкарыстоўваць свае базы падчас налётаў на Лібію. Апроч таго, ІРА ўвесь час супрацоўнічала зь левымі экстрэмістамі, напрыклад з Фронтам Нацыянальнага Вызваленьня Ірляндыі —арганізацыяй мааісцкага кшталту. Але ІРА і Шын Фэйн не дапусьцілі самамаргіналізацыі і заўсёды былі гатовымі на палітычны дыялёг зь Лёнданам.

Першыя такія перамовы адбыліся яшчэ ў 1973 г. Нарэшце, з 1988 г. пачалася новая сэрыя кансультацыяў паміж Лёнданам, Дублінам і ІРА. У сьнежні 1993 г. яна скончылася падпісаньнем сумеснай дэклярацыі. У аснове дэклярацыі была думка, што лёс Паўночнай Ірляндыі павінен вырашацца самім народам Паўночнай Ірляндыі, насуперак старым нацыянальным дактрынам Ірляндыі і Англіі.

Нягледзячы на тое, што дэклярацыю падпісалі прадстаўнікі ірляндзкага і ангельскага ўрадаў, негалосная прысутнасьць ІРА была відавочнай. Ратыфікацыя дамовы фактычна азначала выхад ІРА з падпольля. Хутка была надрукаваная адпаведная заява ІРА пра спыненьне з 31 жніўня 1994 г. вайсковых дзеяньняў супраць Англіі. Для ІРА гэта азначала перамогу. Ангельскі ўрад яўна расьпісаўся ў тым, што за 25 гадоў ня здолеў зламіць волю ірляндцаў. 2 пакаленьні ірляндзкай моладзі шляхам рашучага супраціву дамагліся спыненьня вайсковай прысутнасьці ангельцаў у Ольстэры, якую іхныя бацькі трывалі на працягу трох стагодзьдзяў.

Апошнія падзеі — канфэсійныя сутычкі летам 1996 г. і кастрычніцкія выбухі ІРА — пацьвердзілі рашучасьць рэспубліканцаў давесьці справу незалежнасьці да канца.

**Лёлік Ушкін**

З ГАЗЭТ

# Беларусы інвэстуюць у Польшчу

Немцы, якія прыяжджаюць на аўто, купляюць у Польшчы цыгарэты і паліва, а расейцы і ўкраінцы вывозяць рыбу і садавіну. Славакі, чэхі і літоўцы трацяцца галоўным чынам на адзеньне.

«Ну і што з таго?» – спытае чытач. А тое, што за першыя паўгады 1996 г. чужаземцы патрацілі ў Польшчы 5 млрд. 227,8 млн. злотых (1 USD = 2,5 злотых), або на адну трэць больш, чым за той самы пэрыяд летась. Пра гэта ў мінулы панядзелак паведаміла Gazeta Wyborcza. Узрост чужаземскіх выдаткаў тычыўся аднолькава і харчовых закупаў, і закупаў іншых тавараў, і аплаты побыту ў Польшчы. Гэта значыць, што госьці краіны інвэстуюць свае грошы ў польскую эканоміку, пазбаўляючы інвэстыцыяў на тую ж суму сваю родную краіну. Грошы, патрачаныя хоць бы нават на праезд у мэтро або на бутэльку піва, застаюцца ў Польшчы.

Значную долю ў разьвіцьцё заходняга суседа ўносяць і беларусы. Удзельная вага гасьцей зь Беларусі ў структуры выдаткаў, якія робяць чужаземцы ў Польшчы, складае 14,5%. Паводле гэтага паказчыка Беларусь займае другое (!) месца, саступаючы толькі Нямеччыне (56,5%). Сьледам за Беларусяй ідуць Украіна (14,4), Чэхія (9,2), Славакія (2,3), Літва (1,6) і Расея (1,5).

**П.К.**

ВЫХАД У ГОРАД

# Віно ад Навадворскай

Андранік Антанян



Па дарозе на Галоўпаштамт, на праспэкце Гедыміна (які вельмі паважаная газэта «Имя» чамусьці рэгулярна абзывае «проспектом Гедеминo») насупраць помніка слыннай літоўскай пісьменьніцы Жэмайтэ-Жэмайцене, я сутыкнуўся носам у нос са знаёмым журналістам. Ён бег з аднае прэзэнтацыі на другую і быў, відаць, у добрым гуморы, бо падараваў мне запальнічку і цэлы пачак беларускіх газэт, а сам падаўся кудысьці далей, не раўнуючы як той трус з «Алісы ў краіне цудаў».

У маёй Галоўпаштамтаўскай паштовай скрыні валяліся паштоўкі з усіх магчымых віленскіх бібліятэк, у якіх мілыя бібліятэкаркі ў грозных танах паведамлялі, што калі я здам узяты тры гады таму ў гарадзкой бібліятэцы імя Адама Міцкевіча падручнік нямецкай граматыкі, то мне давядзецца плаціць штраф. А ў апошняй паштоўцы нават пагражалі судом. І яшчэ быў адзін ліст з Масквы, ад знаёмай драматургесы (а мо драматургіні?) Вольгі Мухінай, які, паводле штэмпеля, прабадзяўся ў маёй скрынцы больш за месяц.

Паштоўкі бязьлітасна рвуцца на чатыры часткі й выкідаюцца ў бліжэйшую сьметніцу. Ліст кладзецца ў кішэню курткі. Паляжаў нячытаным месяц, перачакае яшчэ пару гадзінаў.

Выходжу на вуліцу й з палёгкаю ўсьведамляю, што справы, заплянаваныя на сёньня, усе пасьпяхова перароблены.

Зайшоў у кавярню, што ў кінатэатры «Вільнюс». Узяў кавы. Дастаў з заплечніка газэты. У «Белорусской газете» гутарка з Валерыяй Навадворскай. Вялікай аматаркай мітынговай дэмакратыі й сэпаратызму любога разьліву. Высьвятляецца, што нарадзілася яна ў Баранавічах, па-беларуску размаўляе, «Пагоню» сьпявае.

У жыцьці я бачыў Навадворскую толькі аднойчы. 1 сьнежня 1991 году. Сустрэча наша была надта ўжо абсурднай, канфузьлівай і недарэчнай. Ускосна яна зьнітаваная і з маскоўскай драматургесай Вольгай, чый ліст я дастаў з паштовай скрынкі дзесяць хвілінаў таму.

Чатыры гады назад я меў шчасьце вучыцца ў Маскве ў літаратурным інстытуце. Інстытут знаходзіўся ў шыкоўна апісаным Міхаілам Булгакавым «доме Грыбаедава» на Цьвярскім бульвары. На самой справе гэты шыкоўны маскоўскі асабняк ня меў ніякага дачыненьня да расейскага драматурга, бязьлітасна парэзанага крывымі пэрсідзкімі шаблямі.

У інстытут мы маглі трапіць толькі двума шляхамі: альбо праз самы Цьвярскі бульвар, альбо празь Вялікую Бронную, якая, дарэчы, шматкроць меншая за Малую Бронную. На гэтай самай Вялікай Броннай вуліцы знаходзілася некалі самая багемная кавярня ў горадзе Маскве. Наведнікі называлі яе «Стекляшкой». Публіка зьбіралася там самая што ні ёсьць разнастайная. Фігуравалі нават сякія-такія асобы, чые прозьвішчы не сыходзілі з газэтных палосаў. Але асноўную вагу складалі студэнты Літінстытуту, якія мелі за добрую манеру сыходзіць зь сярэдзіны якой-небудзь зануднай лекцыі пра тэорыю мастацкага перакладу на каву.

Бармэнка цётка Люба студэнтаў любіла, заўсёды варыла моцную каву па-турэцку й запякала ў духоўцы фантастычна смачныя канапкі з сырам і паляндвіцаю. І гэта пры тым, што ў Маскве тады было проста голадна. А шостай раніцы каля булачных выбудоўваліся чэргі па хлеб. Цукар, алькаголь і тытунь былі па картках.

Карціны той зімы непрыемныя й ліпкія, як крупа «артэк», звараная бяз цукру, солі й масла. Жорсткія да крыві бойкі мілых маскоўскіх бабулек у чарзе па малако, крадзёж рандоляў на кухнях нашага інтэрнату, гульня у покера, дзе на кон ставіліся талёны на гарэлку, прагнае пажыраньне маскоўскай кінаэлітай салатаў і вінаграду на прэзэнтацыі фільма Жана-Люка Гадара «Нямеччына. Зімовая казка», паскудны смак другі раз заваранай кавы, якую давялося піць у гасьцях у аднаго актора. І ў гэтым брудна-шэрым, страшным горадзе была прыстойная кавярня, дзе заўсёды можна было атрымаць філіжанку гарачай кавы, смачную канапку, залітую расплаўленым сырам, купіць пачак цыгарэт і выпіць колькі хочаш гарэлкі, а часам нават каньяку. У гэтай кавярні мы, студэнты, і пакідалі свае стыпэндыі.

Дык вось, 1 сьнежня 1991 году я выпадкова аказаўся ўдзельнікам сьвяткаваньня дня нараджэньня маскоўскай драматургесы Вольгі Мухінай. Сьвята было сьціплым. Удзельнічала пяць чалавек: сама прычына сьвята, маскоўскі бурат зь вясёлым прозьвішчам Чамаданаў, які пісаў дрэнныя вершы й ніколі гэтага не адмаўляў, ружовашчокі літаратурны крытык Шура Окунеў, Алег Бяспалаў, якога ў вочы й за вочы ўсе мае знаёмыя назвывалі Сапраўдным Майстрам Псыхадэліі, ды я. Пачалося ўсё з таго, што ўсе раптам адмовіліся піць гарэлку. А віно можна было тады купіць ля помніка Пушкіну, у бабулек з торбачкамі, што праводзілі мінакоў прыгаворкай: «Винчик, винчик, водочка, покупаем, молодые люди».

Кінулі жэрабя. Ламаную запалку выцягнуў Шура Окунеў. Але ён матнуў сваімі кудзерамі й адмовіўся йсьці, маўляў, напярэдадні пацягнуў нагу. Другі раз ламаную выцягнуў Чамаданаў, але ён ужо быў на добрым падпітку, а ў накураным памяшканьні яго й зусім разьвезла. Мяне гэта раззлавала, я ўзяў грошы й пайшоў па віно сам.

Да помніка Пушкіну ад кавярні было зусім недалёка. Мэтраў трыста, а мо й меней. Трэба было прайсьці міма чаргі ля Макдональдса, нырнуць у падземны пераход і вынырнуць. Хвілінаў пяць хады — ня болей.

Бабулькі з торбачкамі, якія заўсёды існавалі тут у множным ліку, гэтым вечарам былі прадстаўленыя толькі адной асобай. Нізкая, мажная кабета ў цемнавасьценькім палітоне з футровым каўняром, тоўстыя акуляры на носе. На грудзях у яе віссў зроблены з кавалка ватману плакацік. Што на ім напісана — не разабраць, бо ўжо цёмна. У той год кабеты, што фарцавалі ў маскоўскіх падземных пераходах, на станцыях мэтро й каля нязвыкла пустых гастраномаў, звычайна вешалі сабе на жывот сьпіс сваіх тавараў разам з коштамі.

Згодна з маскоўскім этыкетам я зьвярнуўся да кабеты: «Мать, а у Вас винца не найдется?» У адказ маўчаньне. «Так Вы продаете вино, или как?» Пасьля доўгай паўзы: «Я Валерия Новодворская! А вино Вы можете купить возле Елисеевского». І адвярнулася ад мяне. Віно я сапраўды купіў ля Елісееўскага, і мы яго ўсёй кампаніяй дружна выпілі. А назаўтра з газэт я даведаўся, што Валерыя Навадворская праводзіла пікет у падтрымку незалежнасьці ці то Татарыі, ці то Башкірыі. Зрэшты, якая розьніца за чыю незалежнасьць ты змагаесься?

Толькі мяне займае іншае. Што б я рабіў у гэтую хвіліну, калі б пайшоў на Галоўпаштамт па іншым баку праспэкта?

Севярын Кваткоўскі

# Адна цыгарэта

Цыгарэтны дым павольна танчыць у тахт мэлянхалічнай мэлёдыі, што запаўняе прастору ўтульнага пакою. Адчуваньне матэрыяльнасьці музыкі. Здаецца, нібы ты сам нараджаеш яе ў сваім нутры, і нясьпешна выпускаеш на волю. Струменьчыкі ўдзячна агортваюць цябе, пасьля рассыпаюцца, плаўка вірують у разьвітальным танцы, і зьнікаюць у чорным прастакутніку расчыненага вакна. Ноч. Сьвежае дажджавое паветра ймкнецца расьцярушыць, скрасьці адзінае, што маеш — тытунёвую музыку. Яно як чыйсьці цьвярозы халодны кашмар, які пракраўся ў карункавыя сьветлыя мроі. Яно нібы прывід, які, заблукаўшы ў дажджы, памыліўся вакном. Цяпер ён тут, у пакоі, апанаваным мэлянхалічнай мэлёдыяй. Прывід завяз у тытунёвых струмянях, ён пераляканы й разгублены. «Ня бойся, братка, не сьпяшайся ўцякаць: тытунь зробіць табе новыя абрысы, і, магчыма, з прывіда ты ператворысься ва ўласную дзіўную мрою. Паслухай гэтую мэлёдыю, дакраніся да яе». Працягваеш руку, але трапляеш у мокрую Ноч, у чыйсьці цьвярозы халодны сон. У прастору, якая кліча цябе, як дно бездані кліча канатаходца. У сон, у якім ты ніколі не даляціш да дна. Сон, зь якога ўцякаюць народжаныя ім пачвары — здані Абыякавасьці. Яны як матылі лятуць

# Лістападаўскія рэфлексіі

*3 лістапада беларусы ў Нью-Ёрку адзначылі 75-я ўгодкі паэта Янкі Юхнаўца*

Шырачэзная дошка бара пахне ўсімі магчымымі напоямі. Уладкаваўшыся на высокім зэдліку, сачу за жуком, што вандруе па салодка-горка-духмяных плямах... У пошуках чаго? «Жук, жук, дзе твой дом?»

Віктар Гюго назваў выгнаньне жыцьцём. Авідый — сьмерцю. Напэўна, Янка Юхнавец можа назваць эміграцыю жыцьцём пасьля сьмерці. Бо выгнаньне ня стала для яго няўдачай, паразай, а — магчымасьцю, дала шанец. І ён апынуўся паміж двума сьветамі, атрымаўшы магчымасьць «перакладаць», тлумачыць адзін сьвет другому, параўноўваць адну рэальнасьць з другой. Эміграцыя сталася нараджэньнем паэта. Гэтак і галоўная тэма літаратуры пачалася з Адамавага выгнаньня з Раю. З таго часу пісьменьнікі пішуць або пра Стварэньне, або пра Вяртаньне. Усё іншае — варыяцыі.

У чаканьні дзядзькі Янкі замаўляю бутэльку ягонага любімага чорнага «Портэру» і паводле сыстэмы Картасара (таксама ж эмігрант: Брусэль-Аргентына-Парыж) гартаю старонкі драматычнага начырку «Адам і Ева», твора, які ён даўно напісаў, але толькі цяпер вырашыў надрукаваць:

*Хачу пячору нашую пакінуць,*
*у новую перасяліцца...*

Літаратура эміграцыі можа быць аўтабіяграфіяй, мэтафарай, тэмай, але яна заўсёды патэнцыяльны эпас. Гамэр, Вяргілій, Дантэ... Ці ня эпас вершык выгнанца Багрыма?



За вітражным акенцам невялікага польскага бара ідзе дождж. Мажная жанчынка перапрашае і

# Новы досьвед

Цяпер амаль кожны з нас жыве ў трох прасторах, паводле трох культурных вымярэньняў. Прастора беларускага клясычнага каляніяльнага аўтарытарызму, прастора расейскай алігархічнай дэмакратыі зь яе тэлекультурай і прастора эўрапейскага постіндустрыйнага грамадзтва зь ягоным дрэйфам да ўнівэрсалізму і касмапалітызму. Мы танцуем пад музыку гэтага трыо. Мы думаем паводле трох модаў; мы мысьлім у трох сыстэмах каардынат.

Аўтарытарызм спараджае клясычныя выклікі і правакуе клясычныя адказы культуры на іх: Адамовіч, Новае Неба, Гумянюк, Аркуш, «Візыт дамы», вусатыя пудзілы, змагарныя тэмы ў літаратуры, любоў да гістарычнага, эзопава мова паэтаў пакаленьня Гілевіча, — гэта ня новыя для сусьветнай культуры практыкі.

Маскоўская прастора прышчапляе нам свае практыкі і далягляд. Дакрананьне да Масквы ў некаторых выклікае лёгкую роспач і зайздасьць. Больш пранізьліва адчуваецца наша закутасьць у кайданы велізарнай, беручы ў глябальным маштабе, цывілізацыйнай адсталасьці, памножанай на наступствы акупацыі і навязанага абязмоўліваньня. Мы заціснутыя ў рамкі малюпасенькага — лічаныя дзясяткі тысячаў — кола спажыўцоў культуры, у якім да таго ж палова — не беларусы.

А там, у трэцяй прасторы, стомленасьць постмадэрнізму. І мы сузіраем гэты... шукаю вобраз... росквіт кулінарыі як унівэрсальнага, агульназразумелага мастацтва і вартасьці. Мы сузіраем Грынуэя і Бэсона, як сузіраем нацюрморты галяндцаў... Плён сузіраньня нечага іншага ў эўрапейскім культурным полі можна знайсьці на старонках «Ксэраксу беларускага» і на тазіку «Бум-Бам-Літу». Хоць авангард, далібог, мусіць быць спробай унікнуць формаў, а ня зьместу...

Хіба што Пінігін на шляху ад Купалавых «Тутэйшых» да «Ідыліі» і «Візыту дамы» дае прыклад сынтэзу трох вымярэньняў. Ды яшчэ лепшыя паэты па-ранейшаму жывуць у лепшым сьвеце.

Агульная раздратаванасьць паміж трыма сыстэмамі каарынат запавольвае акрэсьленьне плыняў у сучаснай беларускай культуры. Адцьвілі «Тутэйшыя», і наступіла пустка дасягнутай мэты, дасягнутай незалежнасьці. Усе думалі: за паэзіяй эпохі зьменаў прыйдзе проза. Але замест прозы прыйшло нейкае празаічнае зьдзіўленьне перад новым невядомым. Якое азначэньне можна даць пэрыяду дзевяностых, сярэдзіны дзевяностых?

Перакладаючы Мантэня, я доўга вагаўся зь перадачай назвы ягонага твору: les Essais. Эсэ? Спробы? Нарысы? Вопыты? Досьведы? Нарэшце мне здалося, што пэсымізм Мантэня найперш будзе перададзены жартаўлівым, але пэсымістычным сынтаксысам мудрага вяскавага заходнебеларускага настаўніка. Мудрасьць досьведу

